# 1992 ГОД: ВЫНІКІ НАШАЙ РАБОТЫ

**Як паведамлялася ў папярэднім нумары нашай газеты, на савеце універсітэта 8 студзеня г. г. была заслухана, абмеркавана і зацверджана справаздача рэктара, члена-карэспандэнта АН Беларусі Л. А. Шамяткова аб выніках работы за 1992 год. Прапануем увазе чытачоў яе змест.**

**(Справаздача на савеце ГДУ рэктара члена-карэспандэнта АН Беларусі Л. А. Шамяткова)**

Справаздачны перыяд, адзначыў Л. А. Шамяткоў, быў насычаны паўсядзённай работай па забеспячэнню вучэбнага працэсу, стварэнню ўмоў працы, быту і адпачынку выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў, удасканальванню матэрыяльнай базы. У складаных умовах нестабільнасці эканомікі ў рэспубліцы, інфляцыі, разрыву дзелавых адносін з прадпрыемствамі, арганізацыямі ўсё ж удалося ў цэлым захаваць рэжым працаздольнасці калектыву, а па шэрагу пазіцый дабіцца пэўных поспехаў.

## НАВУЧАЛЬНЫ ПРАЦЭС

На дзевяці факультэтах па 18-ці спецыяльнасцях ва універсітэце праходзяць падрыхтоўку 4258 студэнтаў дзённай і 2702 завочнай форм навучання. Па выніках вясновай экзаменацыйнай сесіі амаль 300 студэнтаў стацыянара атрымалі выдатныя адзнакі, 405 — нездавальняючыя. За непаспяховасць у мінулым годзе адлічана 160 студэнтаў дзённага і столькі ж завочнага навучання. Павялічылася колькасць студэнтаў-завочнікаў, якія атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Калі ў 1991 годзе іх было 665, дык у справаздачным — амаль 700. Асаблівую заклапочанасць выклікае нізкая паспяховасць па дысцыплінах кафедр рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства; матэматычнага аналізу; эканомікі і кіравання вытворчасцю. Прычын нізкай паспяховасці шмат: недастатковы ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў, слабая індывідуальная праца выкладчыкаў са студэнтамі, адсутнасць належнага кантролю за навучальным працэсам загадчыкаў кафедр, дэканаў і іх намеснікаў. Маюць месца зрывы вучэбных заняткаў па французскай мове, філасофіі, самавольныя, несанкцыяваныя пераносы дэканатамі заняткаў і экзаменаў. Адчувальна адбіваецца на якасці і падрыхтоўцы студэнтаў недахоп вучэбнай і метадычнай літаратуры па дысцыплінах правазнаўчага цыклу, гістарычным, па спецыяльнасці «Бухгалтарскі ўлік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці» і інш.

Яшчэ адна з праблем — забяспечанасць аўдыторыямі. Адсутнасць аўдыторый для правядзення заняткаў часта тлумачыцца нерацыянальным складаннем раскладу на дзвюх зменах стацыянара. Таму вучэбнаму аддзелу і дыспетчарскай службе трэба ўзяць пад кантроль выкананне раскладу заняткаў. Адмоўна адбіваецца на арганізацыі навучальнага працэсу неўкамплектаванасць аўдыторый неабходнай мэбляй, крайняя слабая іх асветленасць.

Не выканана рашэнне вучонага савета універсітэта аб распрацоўцы вучэбнага плана кафедрай бухуліку і АГД сумесна з дэканатам завочнага факультэта па падрыхтоўцы спецыялістаў з трохгадовым тэрмінам навучання для асоб, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю.

Летась 1112 выпускнікоў нашага універсітэта атрымалі дыпломы высокакваліфікаваных спецыялістаў, у тым ліку 42— з адзнакай. Упершыню ў справаздачным годзе старшынямі ДЭК былі дэканы або іх намеснікі. Гэта дазволіла з'эканоміць грашовыя сродкі і павысіць адказнасць кафедр і дэканатаў за якасць падрыхтоўкі спецыялістаў.

У мінулым годзе праведзена работа па рэарганізацыі некаторых кафедр грамадска-гуманітарнага цыкла. Ліквідаваны кафедры палітычнай эканоміі, палітычнай гісторыі XX ст., гісторыі СССР і БССР; этыкі, эстэтыкі і гісторыі культуры. Адкрыты новыя кафедры: гісторыі Беларусі; гісторыі ўсходнеславянскіх народаў; эканамічных тэорый; культуралогіі; палітычнай сацыялогіі. Усе яны, а таксама кафедры філасофіі і фізічнага выхавання ўключаны ў склад адпаведных факультэтаў. Гэта не азначае проста кадравыя перастаноўкі. Рэарганізацыя структуры кафедр мае на ўвазе паглыбленую пераарыентацыю вучэбнай, навуковай і метадычнай работы з улікам сучасных патрабаванняў.

У плане новых падыходаў да вырашэння задач падрыхтоўкі сучаснага спецыяліста многае мы ускладваем на адкрыццё спецыялізацыі «Арганізацыя і ўлік знешнеэканамічнай дзейнасці» для найбольш падрыхтаваных студэнтаў эканамічнага факультэта. Дарэчы, у справаздачным перыядзе ўмацаваліся нашы сувязі з навучальнымі ўстановамі замежных краін. Ва універсітэце на філалагічным і матэматычным факультэтах навучаўся 51 студэнт па міждзяржаўных пагадненнях. У аспірантуры на філфаку навучалася 4 чалавекі і на матфаку — 1. 9 чалавек закончылі поўны курс універсітэта: двое філолагаў і сямёра матэматыкаў. Па розных прычынах з універсітэта было адлічана 5 чалавек, прыбыло на вучобу — 18.

У цяперашні час на 1—5 курсах і ў аспірантуры навучаецца 58 чалавек, па індывідуальных кантрактах (стажыроўка, тэрмін закончыўся 1 студзеня 1993 г.) на філалагічным, матэматычным і эканамічным факультэтах) з 21 краіны. З 1992 года ва універсітэце па кантракту навучаецца 30 юнакоў і дзяўчат з КНР.

Работа з замежнымі студэнтамі ўскладвае на ўсіх нас вялікія абавязкі і адказнасць. Думаю, што створаны аддзел міжнародных сувязей стане сапраўдным каардынатарам у наладжванні нармальных умоў для вучобы, быту і адпачынку замежных студэнтаў, аспірантаў і стажораў. Многае ў гэтым плане неабходна зрабіць і прарэктару па гаспадарчай рабоце У. М. Палевікову.

## ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ — СПРАВА ВАЖНАЯ

Вучэбная работа, працягваў далей Л. А. Шамяткоў, яе поспех у многім залежыць ад прафарыентацыйнай накіраванасці. Трэба адзначыць, што ў мінулым годзе яна праводзілася даволі эфектыўна, што забяспечыла якасны набор першакурснікаў, аб чым падрабязна гаварылася на нядаўнім пасяджэнні вучонага савета. Яе стабілізацыі, разнастайнасці форм садзейнічала адкрыццё факультэта давузаўскай падрыхтоўкі і кафедры псіхалагічнай дыягностыкі і давузаўскай падрыхтоўкі.

У 1992 годзе працягвалася работа ў спецыялізаваных класах пры ГДУ на базе СШ № 56. Адбыўся першы выпуск вучняў 11-га класа (пасля двух гадоў навучання). Сумешчаныя экзамены прыкладна палавіна вучняў здала без здавальняючых адзнак і была залічана ва універсітэт у адпаведнасці з палажэннем аб спецыялізаваных класах. Астатнія выпускнікі гэтай школы здавалі экзамены на агульных падставах і амаль усе былі залічаны па конкурсу. Гэта сведчыць, з аднаго боку, аб высокім узроўні патрабаванняў, якія ставяцца на сумешчаных экзаменах, і аб дастаткова добрай падрыхтоўцы вучняў, з другога боку.

Працягвалася работа ў Буда-Кашалёўскай (раённай) вочна-завочнай школе пры факультэце давузаўскай падрыхтоўкі ГДУ, дзе летась адбыўся першы выпуск. Вучні гэтай школы здавалі сумешчаныя экзамены (толькі па прафілюючых дысцыплінах) і ўдзельнічалі ў агульным конкурсе пры паступленні ва універсітэт з атрыманымі адзнакамі. Варта адзначыць, што ў Буда-Кашалёўскай школе вядзецца падрыхтоўка лепшых вучняў школ гэтага раёна толькі на педагагічныя спецыяльнасці. На ўступных экзаменах большасць з іх атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі.

Працягвае функцыяніраваць вучэбна-вытворчы камбінат на матэматычным, філалагічным, фізічным факультэтах і факультэце фізічнай культуры.

Усяго ў цяперашні час выкладчыкі ГДУ непасрэдна ўдзельнічаюць у давузаўскай падрыхтоўцы вучняў 10 і 11 класаў 30-ці класаў Гомельскай вобласці.

Заключаны дагавор і пачата арганізацыя вучэбна-вытворчага камбіната па распрацоўцы вучэбна-метадычнага забеспячэння для добрушскай гімназіі № 1.

Навуковай ідэяй, якая аб'ядноўвае разнародны састаў кафедры псіхалагічнай дыягностыкі і давузаўскай падрыхтоўкі, з'яўляецца праблема прафесіянальнага адбору абітурыентаў на падрыхтоўчае аддзяленне і ў спецкласы пры універсітэце на аснове псіхадыягностыкі схільнасцей і здольнасцей. Зацікаўлены ўдзел выкладчыкаў у мерапрыемствах, якія праводзяцца на кафедры і факультэце, дазволіў вызначыць тэму НДР на 1993 год: «Удасканальванне метадаў вызначэння прыгоднасці школьнікаў да навучання на падрыхтоўчым аддзяленні і ў спецкласах пры ГДУ».

Бясспрэчна, названым факультэту, кафедры, падрыхтоўчаму аддзяленню яшчэ патрэбна вырашыць шэраг праблем па паляпшэнню якасці сваёй работы. Але ім патрэбна і дапамагчы ва ўкамплектаванні кадрамі, у матэрыяльным забеспячэнні.

## НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Гэтыя праблемы стаяць не толькі перад названымі падраздзяленнямі. Ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі з многімі цяжкасцямі давялося сутыкнуцца універсітэцкай навуцы. На чарговым вучоным савеце мы падрабязна прааналізуем яе поспехі і перспектывы. Сёння ж хочацца адзначыць галоўнае: захаваны высокі творчы патэнцыял, навуковыя калектывы; пашырылася і ўзмацнела міжнароднае супрацоўніцтва — вучоныя універсітэта прынялі ўдзел у канферэнцыях і стажыроўках у ЗША, Кітаі, Польшчы, Нідэрландах.

Навуковая дзейнасць універсітэта ажыццяўлялася ў напружаных умовах фінансавання. Да канца года, напрыклад, адбылася абвальная індэксацыя амаль усіх дзяржбюджэтных цэн, і універсітэт трапіў у становішча фінансавага перанасычэння каштарысаў па тэмах, калі вельмі складана хутка расходаваць сродкі па артыкулах — матэрыялы, абсталяванне, уключаючы і заработную плату. Тым не менш універсітэт паспяхова справіўся з усімі ўзнікшымі прыемнымі і не вельмі прыемнымі праблемамі. Выкананы тэматычны план універсітэта. Агульны аб'ём фінансавання па дзяржбюджэтных і гаспдагаворных работах склаў 13055,1 тыс. руб., што перавышае ўзровень 1991 г. на 14,4%. Пры гэтым дзяржбюджэтнае фінансаванне ўзрасло на 91,6% (1991 г. — 943,6 тыс. руб, 1992 г. — 11261,8 тыс. руб.; у тым ліку па тэмах, фінансуемых Міністэрствам адукацыі, — 6700 тыс. руб., па праграмах «Чарнобыль» і «Дзеці Чарнобыля» — 2696 тыс. руб., дзяржзаказ — 2160 тыс. руб., па навукова-тэхнічных рэспубліканскіх праграмах — 1420 тыс. руб. Упершыню выдзеліў фінансаванне ў суме 900 тыс. руб. Фонд фундаментальных даследаванняў. Аб'ём гаспдагаворных НДР склаў 1793,3 тыс. руб. Заўважым, што дзякуючы актыўнасці кафедр, лабараторый, творчых калектываў універсітэцкая навука ў такі складаны час атрымала значную фінансавую падтрымку.

У 1992 годзе выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта выступілі на 33-х навуковых канферэнцыях са 161 дакладам.

Агульны аб'ём выданняў універсітэта склаў 213,91 друкаванага аркуша. Апублікавана 80 артыкулаў у часопісах і зборніках, з іх 6 у замежных выданнях. Выдадзена 4 манаграфіі, 3 вучэбныя дапаможнікі, адзін з якіх з грыфам Міністэрства.

Разам з тым трэба адзначыць, што некалькі знізілася вынаходніцкая дзейнасць універсітэта з-за арганізацыйных перабудоў на міжрэспубліканскім узроўні патэнтных служб. І ўсё ж летась атрымана 14 станоўчых рашэнняў аб выдачы патэнтаў на вынаходніцтвы.

## ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ

Мінулы год быў ураджайным для нашай аспірантуры. Яе закончылі 17 чалавек: 10 — стацыянарна, 7 — завочна. Адзін з выпускнікоў аспірантуры датэрмінова абараніў кандыдацкую дысертацыю, 5 — прадставілі дысертацыі да абароны. Эфектыўнасць работы аспірантуры склала 35%. У прыватнасці, датэрмінова абараніла кандыдацкую дысертацыю Фядосенка Людміла Васільеўна з кафедры эканомікі і сацыялогіі працы пад навуковым кіраўніцтвам прафесара В. В. Адзінчука з Масквы.

Летась у аспірантуру было прынята 19 чалавек: 14 — на стацыянар, 5 — на завочную форму навучання. 11 яе навабранцаў — выпускнікі ВНУ 1992 года. 4 чалавекі паступілі ў мэтавую аспірантуру: 2 — на стацыянар і столькі ж — на завочную форму падрыхтоўкі.

У 1992 годзе абаронена 15 кандыдацкіх дысертацый, з іх 9 — выпускнікамі аспірантуры універсітэта розных гадоў. Як ні адзін іншы мінулы год быў плённы на доктарскія дысертацыі. Іх абаранілі Я. С. Барыс, С. С. Гіргель, Ю. У. Малінкоўскі — па фізіка-матэматычных навуках, І. М. Мельнічэнка — тэхнічных, Э. М. Энцін — гістарычных і М. А. Дзмітрыеў — па педагагічных.

Стажор з Кітая Го Вэньбінь пад маім кіраўніцтвам выканаў, абараніў дысертацыю і атрымаў ступень доктара філасофіі ў галіне фізікі і матэматыкі.

За мінулы год мы змаглі значна палепшыць якасны састаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў, які, як вядома, панёс адчувальныя страты ў сувязі з чарнобыльскай катастрофай. У гэтым напрамку нам патрэбна яшчэ шмат папрацаваць, у тым ліку аспірантуры і аддзелу кадраў.

На 1992—93 навучальны год зацверджаны штат прафесарска-выкладчыцкага саставу ў колькасці 581 адзінкі. На 1-е снежня 1992 года ў штаце універсітэта налічвалася 511 выкладчыкаў. На ўмовах сумяшчальніцтва на 0,25 і 0,5 ставак працуе 149 выкладчыкаў універсітэта і 27 чалавек з іншых арганізацый. На сённяшні дзень ёсць 13 вакансій. У параўнанні з папярэднімі гадамі колькасць вакансій істотна зменшылася.

У мінулым годзе па конкурсу выбрана 43 чалавекі. На пасады прафесараў пераведзены ўсе выкладчыкі, якія абаранілі доктарскія дысертацыі. Летась, як і ў 1991 г., на пасады старшых выкладчыкаў былі пераведзены выкладчыкі з вялікім стажам працы і кандыдаты навук. Летась да нас на працу прыбыло 19 маладых спецыялістаў. З 1 верасня на выкладчыцкую працу прынята 12 чалавек з іншых арганізацый. На 1 снежня 1992 г. па розных прычынах звольнілася 29 чалавек прафесарска-выкладчыцкага саставу.

БЯССПРЭЧНА, сказаў у заключэнне Л. А. Шамяткоў, праблем наперадзе шмат. Гэта і фінансавае забяспячэнне, і выкананне значнага аб'ёму будаўнічых работ, капітальнага рамонту, работа грамадскіх арганізацый. За іх выкананне будуць несці адказнасць канкрэтныя кіраўнікі адпаведных падраздзяленняў. І я жадаю ўсяму нашаму калектыву новых поспехаў.

# А для дзяцей найбольшае свята...

У наш бедны на радасці час прафком універсітэта выкарыстоўвае ўсе наяўныя магчымасці для аказання дапамогі членам прафсаюза. На асаблівым рахунку ў яго знаходзяцца групы супрацоўнікаў найменш сацыяльна абароненыя. У прыватнасці, мнагадзетныя сем'і.

Так, днямі аказвалася гуманітарная дапамога з Германіі па лініі фонда мнагадзетных сем'яў. Прафком дабіўся, каб гэты фонд уключыў у спісы на аказанне дапамогі мнагадзетныя сем'і супрацоўнікаў універсітэта звыш устаноўленай разнарадкі. У выніку восем мнагадзетных сем'яў супрацоўнікаў ГДУ атрымалі па 10 кг макаронаў, мукі, амаль 14 літраў сокаў, шмат кандытарскіх вырабаў. Дапамогу на адну сям'ю можна было з цяжкасцю аднесці толькі двум чалавекам.

Дапамога атрымана ў многім і дзякуючы намаганням асістэнта кафедры эканомікі і сацыялогіі працы А. Л. Вайцішкінай.

Такая колькасць ласункаў і сокаў з'явілася для нашых дзяцей сапраўдным святам. За іх шчыра дзякую чулым супрацоўнікам нашага прафкома.

К. УСОВІЧ,
загадчык музея-лабараторыі Ф. Скарыны.

*У рэдакцыйнай пошце—паэзія*

Ольга КОВАЛЕНКО,
студентка I курса филфака.

## ОТРЕЧЕНИЕ

Я отрекаюсь от всего,
Что делает меня жестокой.
Я отрекаюсь от того,
Кто душу сделал одинокой.
Я отрекаюсь ото лжи,
Что гложет свет и век наш
смутный.
Как колоски засохшей ржи,
Что бросишь под ноги минутно.
Я отрекаюсь ото зла,
Что в нас заложено с рожденья,
Я отрекаюсь от вина,
Что держит нас в часы забвенья.
Я отрекаюсь от друзей,
Кто предают тебя с улыбкой.
От глупых девичьих идей,
От звуков старой, чудной скрипки.
Я отрекаюсь, чтобы вновь
Не совершить былых промахов,
Чтобы сберечь свою любовь,
Не положить её на плаху.
Я отрекаюсь от зимы,
Что в сердце каждом притаилась
И от безумства той мечты,
Что мне, увы, так долго снилась.

—◆—

Сергей МОРОЗ,
студент I курса филфака.

## НЕ ДАЙ

Плохо обо мне, прошу, не думай.
И о новой встрече не мечтай.
Ни деянием, ни тайной думой
Мне не дай унизиться, не дай!
Не дари укоров и улыбок,
Страстно рук при встрече не сжимай.
Мной допущено достаточно ошибок,
Мне не дай унизиться, не дай!
Тайным чувствам не позволь
продлиться,
Мы виновны... Ты — не обвиняй.
Помоги забыть, но не забыться,
И не дай унизиться, не дай!

*Народны каляндар*

## СТУДЗЕНЬ

19-га студзеня. Хрышчэнне Госпада Бога. «На Хрышчэнне снег камякамі — да ўраджаю, ясны дзень — да неўраджаю».

25-га. Таццянін дзень. Сонца на Таццяну — да ранняга прылёту птушак, снег — да дажджлівага лета.

28-га. «Прападобны Павел — дзень дабавіў». Зорная ноч — да ўраджаю.

30-га. Дзень Антона-Перазімніка.

31-га. Афанасій-ламанос. Сонца ў поўдзень — да ранняй вясны.



Каляднае свята каля самавара.
Фота У. Чысціка.

*Спорт*

# ДРУГІЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ І... У ВОБЛАСЦІ

Завяршылася 1-я абласная спартакіяда сярод студэнтаў ВНУ, якая праходзіла па трох відах спорту: плаванню, валейболу і настольнаму тэнісу.

Пракаменціраваць вынікі абласной спартакіяды мы папрасілі галоўнага спецыяліста Гомельскага аблспарткамітэта Якава Пратасава. Вось што ён сказаў:

— Трэба падкрэсліць, што першая абласная спартакіяда прайшла на добрым арганізацыйным узроўні. Вынікі яе наступныя: на 1 месцы — Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, на 2-м—Гомельскі універсітэт і на трэцім — Гомельскі політэхнічны інстытут.

Скажу шчыра, што студэнты універсітэта не на «сваім» месцы. Мы ж ведаем патэнцыяльныя магчымасці ГДУ. Гэта адбылося, на мой погляд, з-за арганізацыйных «праколаў», якія дапусцілі трэнеры па відах спорту. Думаю, што гэта часовае адступленне.

Хачу падкрэсліць, што прынята рашэнне праводзіць падобныя спартакіяды штогод і спадзяюся, што ўжо сёлета універсітэт зойме свае законнае месца...

Цяжка штосьці дадаць да слоў Якава Максімавіча, але, будзем спадзявацца, што падобнае больш не паўтарыцца, таму што ў мінулым годзе наш універсітэт заняў ганаровае другое месца ў рэспубліканскай спартакіядзе, дзе барацьбу за ўзнагароды вялі больш 30 ВНУ.

## КАЛІ Ў ВАС БЯДА

У Гомелі адкрылася служба даверу. Кожны, хто пажадае, набраўшы нумар тэлефона 3-47-23, пачуе добрую параду і падтрымку. Ананімнасць размовы гарантуецца. Тэлефон даверу працуе штодзённа з 17.00 да 20.00. Выхадныя дні: субота і нядзеля. Не замыкайцеся ў сваёй бядзе, званіце! Вам пастараюцца дапамагчы вопытныя псіхолагі.

*Хочаце—верце, хочаце—праверце*

# ЗНОЙДЗЕНЫ ПАПІРУС, ДЗЕ ПРАДКАЗАНА ГІСТОРЫЯ ЧАЛАВЕЦТВА ДА 2055 ГОДА

**Як паведаміла канадская газета «Уіклі уорлд ньюс», у 1987 годзе ля берагоў Багамскіх астравоў акіянолагі знайшлі старажытную урну. Вазу «даследавалі» рэнтгенаўскім апаратам. На здзіўленне вучоных, яны заўважылі скрутак, які потым аказаўся папірусам. Вугляродны аналіз паказаў, што знаходцы ад 4000 да 4500 гадоў. Калі запісы нядаўна расшыфравалі, вучоныя здзівіліся яшчэ больш: папірус утрымліваў прадказанні будучага.**

Напрыклад, у папірусе прадказана існаванне Настрадамуса, які ў свой час прадказаў з'яўленне Гітлера і эпідэміі СНІДа. Указана дата адкрыцця Калумбам Амерыкі — 1492 год, а таксама вялікая крывавая падзея на Амерыканскім кантыненце — Грамадзянская вайна мінулага стагоддзя. У будучым бачылася развіццё тэхнікі для палётаў, нават ёсць апісанне высокаскарасных лайнераў. На 1969 год прызначалася высадка чалавека на Месяц. Менавіта ў гэтым годзе на Месяцы з'явіўся амерыканскі міжпланетны экіпаж.

Цікава, што тысячы гадоў назад прадказвалася знікненне магутнай сусветнай дзяржавы. Магчыма, гэта можна аднесці да былога Савецкага Саюза. Праўда, год называўся не 1991, а 1992-гі (можа, распад яшчэ не зусім завяршыўся?).

А вось для другой магутнай сусветнай дзяржавы прадказвалася з'яўленне новага моцнага лідэра, які раней не быў звязаны з палітычнымі коламі. Амерыканскія эксперты адразу назвалі свайго земляка, мультымільярдэра Роса Перо, які вылучыў сваю кандыдатуру на пасаду прэзідэнта ЗША. Але гэты прагноз не спраўдзіўся.

У выніку падзення велізарнага метэарыта ў 1994 годзе, абяцае загадкавы папірус, загіне нейкая «злая нацыя Сярэдняга Усходу». Газета «Уіклі уорлд ньюс» мяркуе, што гэта сённяшні Ірак. Трэба думаць, астатнія сярэднеўсходнія нацыі нязлыя.

Нашых чытачоў павінна прымусіць задумацца наступнае прадказанне папіруса. К 2021 году, сведчыць ён, «людзям не трэба будзе працаваць». Але вучоныя-дэшыфроўшчыкі не сцвярджаюць, што гаворка ідзе аб перамозе рабатызацыі ў вытворчасці і быце.

Ці не можа здарыцца так, што людзі зусім абляну́юцца і не захочуць працаваць?.. Прыкладаў таму, здаецца, ужо і цяпер дастаткова.

Пакуль палітыкі спрачаюцца, як забараніць ядзерную зброю, дзесьці вядуцца вялікія распрацоўкі адваротнага характару. Як жа іначай растлумачыць, што папірус прадказвае на 2032 год з'яўленне персанальнай зброі, больш магутнай, чым ядзерная. А яшчэ праз чатыры гады (2036 г.) народзіцца дзіця з незвычайна высокім інтэлектам.

На 2043 год назначана стварэнне «таблетак маладосці», ці такога прэпарата, які прадоўжыць чалавечае жыццё яшчэ на сто гадоў. Эх, дажыць бы ды прыняць іх...

У 2052 годзе, на думку старажытнага аракула, будзе адкрыта нейкая прыстаўка да чалавечых мазгоў, для тэлепатычнай сувязі на адлегласці. Мабыць, гэта вынаходства называецца шарыкамі, якіх можна будзе дабіраць у выпадку нястачы ўласных?

Дзіўна, што пры сённяшніх ужо высотах навукі і тэхнікі з папірусная далёка нам гаварыць: у 2055 годзе знікнуць вядомыя раслінныя арганізмы. У адносінах да СНД (калі захаваецца) гэта хутчэй за ўсё азначае, што зімой 2055 года бульбы ў магазінах зноў не будзе.

Больш таго, на гэтым годзе заканчваюцца прадказанні старажытнага празорца. Доктар Лео Фрыдрых з Новай Зеландыі каменціруе гэты факт наступным чынам. Здаецца, нас падводзяць да думкі, што ў 2055 годзе штосьці здарыцца. Даволі змрочная перспектыва, тым больш, што многае з прадказанняў ужо збылося.

**Вось такія звесткі дайшлі да нас з далёкага часу. Справа чытачоў — верыць ці не верыць сенсацыйным прагнозам. Аднак калі прыняць да ўвагі, што да 2055 года яшчэ шэсцьдзесят два гады і самае страшнае здарыцца толькі тады, а не заўтра і не ў двухтысячным, як абяцалі раней, мабыць, можна з палёгкай уздыхнуць і проста пачаць жыць. Час дазваляе.**

**(Перадрукавана з газеты «Звязда»).**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Спонсары газеты — Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП «Сучасныя тэхналогіі», прафком студэнтаў.

Гомельская фабрыка «Палесдрук» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь г. Гомель, Савецкая, 1.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 35.

Падпісана да друку ў 15.00.